# 5 снежня працоўныя нашай краіны ўрачыста адзначылі

## Дзень Савецкай Канстытуцыі




*Малюнак студэнта аддзялення журналістыкі Міхася ЗНАКА.*

Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА ЛКСМБ І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА імя У. І. ЛЕНІНА

№ 30 (545) Субота, 7 снежня 1963 г. Цана 1 кап. Год выдання XVII-ы

# ДАРОГАЙ ШЧАСЦЯ

Дзень Савецкай Канстытуцыі.., Кожны раз, сустракаючы гэта свята, я ўспамінаю расказы сваіх бацькоў аб цяжкім мінулым народа Заходняй Беларусі, якому толькі Савецкая ўлада прынесла шчаслівае, радаснае жыццё.

Мае дзяды і бацькі вытрымалі ўсе пакуты жыцця пры былой, старой Польшчы. Памятаю, калі я была маленькая, мне маці часта расказвала аб злой пані, якая нібыта не так даўно жыла за тры кіламетры ад нашай вёскі ў вялікім, прыгожым маёнтку. Маці апавядала, як загінуў яе дзед ад панскіх бізуноў, аб гары, якую назвалі Катавай за катаванні на ёй батракоў. Усё гэта мне здавалася страшнай казкай.

Але вось я падрасла, пайшла ў школу, навучылася пісаць, чытаць. Прыношу маці дзённік, а яна выводзіць нейкія незразумелыя літары. «Гэта па-польску, — адказвае маці на маё маўклівае пытанне. — Пры панах немагчыма было вучыцца на роднай мове. Вучыліся на польскай і то ўсяго 3—4 гады, калі не меней». Хутка я скончыла школу. Шчаслівым і радасным было маё дзяцінства. Вучоба давалася лёгка.

На выпускным вечары мы атрымоўваем атэстат, а ў нашых бацькоў — слёзы на вачах. Бацька аднаго з нашых выпускнікоў устае і ціхім ад хвалявання голасам гаворыць аб тым, што не толькі аб атэстатах, але і аб чатырохкласнай адукацыі раней не магло быць і размовы. «Перад вамі ж цяпер адкрыты ўсе дарогі, усё наша Радзіма дае людзям. Толькі і вы не забывайце аб сваім абавязку перад ёй»,—назаўсёды мы запомнілі гэтыя словы яго.

Многія з нас вучацца ў інстытутах, працуюць у калгасах, на прадпрыемствах. Адбудавалася наша мястэчка. А колькі цудоўных людзей вырасла тут! З 13 выпускаў нашай школы навучаюцца ва ВНУ каля 130 чалавек, многія з'яўляюцца перадавікамі сельскай гаспадаркі. Прычым многія з іх займаюцца завочна. З жыхароў нашага мястэчка сталі ўрачамі 15 чалавек, настаўнікамі — 20, аграномамі — 32, афіцэрамі Савецкай Арміі — 10, шасцёра займаюцца ў аспірантуры Масквы і Ленінграда.

Наша вёска з кожным годам ператвараецца ў прыгожы гарадскі пасёлак. У ёй вырас цудоўны будынак бальніцы.

Нядаўна вярнуўся з Амерыкі на сваю радзіму адзін з жыхароў нашай вёскі. Якое ж яго было здзіўленне, калі на месцы старых разбураных хацін ён убачыў добротныя дамы гарадскога тыпу, новую школу, асфальтаваныя вуліцы.

Не пазнаць былую Заходнюю Беларусь. Усяго за якія-небудзь 24 гады змянілася яе аблічча. Шчаслівым жыццём зажыў яе народ. Вось чаму я з такой радасцю і гордасцю, як член вялікай савецкай сям'і, разам з рускімі, украінцамі, таджыкамі, узбекамі, з братамі-беларусамі кожны раз вітаю 5 снежня, дзень самых справядлівых на зямлі законаў.

Ядвіга ІВУЦЬ,
студэнтка 3 курса матфака.

## Новы састаў партыйнага камітэта універсітэта

Сакратар партыйнага камітэта — **БУРАЎСКІ Андрэй Яфімавіч.**

Намеснік сакратара па ідэалагічнай рабоце — **ЦАКУНОЎ Уладзімір Васільевіч**, дацэнт кафедры палітычнай эканоміі.

Намеснік сакратара па арганізацыйнай рабоце — **ІГНАЦЕНКА Іларыён Мяфодзьевіч**, дэкан падрыхтоўчага факультэта.

Старшыня групы садзеяння партыйна-дзяржаўнаму кантролю, намеснік сакратара — **ЕЎДАКІМАЎ Пётр Канстанцінавіч**, дацэнт юрыдычнага факультэта.

Член партыйнага камітэта — **СЕЎЧАНКА Антон Нікіфаравіч**, рэк[redacted]ерсітэта.

Сектар пр[redacted]анды і агітацыі — **КЛЯЎЧЭНЯ Аляксандр Сямёнавіч**, дацэнт кафедры гісторыі філасофіі і логікі.

Сектар навукова-даследчай работы — **ВАЛАДЗЬКО Леанід Вікенцьевіч**, загадчык кафедры фізічнага факультэта.

Сектар вучэбнай работы — **СКАПЦОЎ Сяргей Герасімавіч**, намеснік дэкана гістарычнага факультэта.

Сектар друку і радыёвяшчання — **КАЗЛОВА Ольга Васільеўна**, дацэнт філалагічнага факультэта, і **ТКАЧ Вера Максімаўна**, студэнтка 3 курса біялагічнага факультэта.

Культурна-масавы сектар — **ЛАПЦЕНАК Васіль Данілавіч**, дацэнт кафедры дыялектычнага і гістарычнага матэрыялізма.

Сектар спартыўна-масавай і абароннай работы—**КАВАЛЬЧУК Мікалай Сафронавіч**, студэнт 4 курса юрыдычнага факультэта.

Сектар работы сярод замежных студэнтаў — **ГУСЕЎ Юрый Аляксандравіч**, выкладчык кафедры дыялектычнага і гістарычнага матэрыялізма.

Сектар шэфскай работы — **ШЛЫК Валерыя Рыгораўна**, дацэнт хімічнага факультэта.

Адказны за работу добраахвотнай народнай дружыны — **РЫЛЮК Георгій Якаўлевіч**, сакратар камітэта камсамола

# ВЯЛІКАЕ ПРАВА

Штогод наша краіна ўрачыста адзначае Дзень Савецкай Канстытуцыі, якая прадаставіла савецкім людзям важнейшыя грамадскія і палітычныя правы. У прыватнасці, у Канстытуцыі гаворыцца аб праве грамадзян на працу, адпачынак і адукацыю. А праца, як вядома, заўсёды з'яўлялася асновай жыцця грамадства. Але толькі ў савецкі час праца ўпершыню ў гісторыі стала абавязкам і вялікім правам кожнага чалавека. Цяпер на прадпрыемствах нашай краіны працуюць дзесяткі мільёнаў людзей, для якіх праца з'яўляецца штодзённай патрэбнасцю і гонарам. Новы від вытворчых адносін дае магчымасць развіццю ініцыятывы рабочых, выклікае ўзмоцнены рост камуністычнага спаборніцтва.

У нашай краіне, як нідзе больш, клапацяцца аб паляпшэнні ўмоў працы. Высокі ўзровень аўтаматызацыі і механізацыі вытворчых працэсаў дазволіў вялікай частцы рабочых стаць студэнтамі вышэйшых і сярэдніх спецыяльных устаноў. Цяпер асабліва расшырылася сетка вячэрняга і завочнага навучання.

На нашым 1 курсе вячэрняга аддзялення журналістыкі займаюцца людзі 18 розных прафесій, некаторыя з іх — былыя калгаснікі. Цяпер ўсе мы працуем на мінскіх прадпрыемствах, і ўдзел у агульнай працы на карысць роднай краіны дапамагае нам паспяхова вучыцца.

Канстытуцыя СССР — самая справядлівая канстытуцыя ў свеце. І савецкія людзі ганарацца тым, што ў іх краіне народ з'яўляецца адзіным гаспадаром усіх багаццяў.

Ала ДЗЕРАШ.

## *ПАМЯТНЫ ЗНАЧОК*

Дарагі сябар! Сёння ты вучышся ў Беларускім дзяржаўным універсітэце імя У. І. Леніна. Праз колькі часу ты пакінеш яго сцены і будзеш працаваць у школе ці ў заводскай лабараторыі, у навуковай установе, ці ў судзебных органах. Усюды, усё жыццё ты будзеш успамінаць свой БДУ, які даў табе веды, спецыяльнасць, які накіраваў цябе ў жыццёвы шлях.

Рэктарат аб'явіў конкурс на лепшы памятны значок БДУ імя У. І. Леніна. Калі ласка, прынось эскіз памятнага значка ў камітэт камсамола. Журы адбярэ з усіх эскізаў лепшы, па якому будзе заказвацца значок. Спяшайся, бо чым раней ты прынясеш эскіз, тым раней можна будзе зрабіць значок.

*Людзі розных нацыянальнасцей займаюцца ў Беларускім дзяржаўным універсітэце імя У. І. Леніна. Усе яны карыстаюцца роўнымі правамі, ва ўсіх адна мэта— стаць высокакваліфікаванымі спецыялістамі і ўключыцца ў актыўнае будаўніцтва камуністычнага грамадства. Для гэтага ёсць ўсе магчымасці: наш універсітэт мае выдатныя кадры навуковых работнікаў і прапагандыстаў, яго лабараторыі абсталяваны навейшым абсталяваннем, да паслуг студэнтаў і аспірантаў — бібліятэка, чытальныя залы і кабінеты з багацейшым кніжным фондам.*

На здымку: *у адной з лабараторый фізічнага факультэта.*



